# Конкурс “Настаўнік года” стартуе ў Беларусі

У час прэс-канферэнцыі
Сёння адбудзецца ўрачыстае адкрыццё конкурсу прафесійнага майстэрства “Настаўнік года Рэспублікі Беларусь”, паведаміў журналістам у прэс-цэнтры БЕЛТА намеснік міністра адукацыі Аляксандр Кадлубай.

У фінале будуць змагацца 56 педагогаў, якія перамаглі ў абласных і Мінскіх гарадскіх этапах. Праграма конкурсу вельмі насычаная: самапрадстаўленне ўдзельнікаў, урокі ў незнаёмым класе, тэсціраванне і майстар-класы.

“Сярод значных мерапрыемстваў сістэмы адукацыі конкурс “Настаўнік года Рэспублікі Беларусь” займае асаблівае месца. Ён прыцягвае ўвагу не толькі настаўніцтва, але і з-за спецыфікі адукацыі – шырокіх слаёў грамадства. Кожны конкурс дае магчымасць раскрыцца новым педагагічным талентам, абагульніць і трансліраваць новую педагагічную практыку. Ён накіраваны на павышэнне якасці адукацыі, развіццё творчых ініцыятыў педагагічных работнікаў па рэалізацыі зместу адукацыйных праграм асноўнай і спецыяльнай адукацыі, рост прафмайстэрства, падтрымку эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, павышэнне прэстыжу педагагічнай работы і прызнанне ўкладу педработнікаў у развіццё сістэмы адукацыі”, – сказаў Аляксандр Кадлубай .

Намеснік міністра нагадаў, што такія конкурсы ў нашай краіне праводзяцца з 1991 года. Спачатку гэта былі рэспубліканскія этапы Усесаюзнага конкурсу. Знамянальна, што першым і адзіным настаўнікам года СССР стаў у 1991 годзе настаўнік фізікі сярэдняй школы нумар 49 Мінска Валерый Гербутаў. З 1992 года конкурсы педагагічнага майстэрства сталі рэспубліканскімі. Да 2014 года ў іх удзельнічаў 21 педагог – па 3 прадстаўнікі ад

кожнага рэгіёна незалежна ад прадмета выкладання. Ацэнку праяўленаму прафмайстэрству настаўнікаў давала агульнае журы. Цяпер конкурс улічвае прадмет, які выкладае педагог, і арыентаваны на 8 прадметных намінацый.

Асноўныя конкурсныя выпрабаванні стартуюць з заўтрашняга дня. 30 верасня вызначацца 8 суперфіналістаў. Імя пераможцы стане вядома 2 кастрычніка. Галоўны прыз — аўтамабіль. “Мы ўпэўнены, што гэты конкурс, як і яго папярэднікі, адкрые новыя імёны і будзе садзейнічаць новым прафесійным кантактам”, — адзначыў Аляксандр Кадлубай.

Як дадала прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Галіна Нікалаенка, сярод фіналістаў бягучага года 42 жанчыны і 14 мужчын. “Усе маюць вышэйшую адукацыю. Сярэдні стаж педагагічнай дзейнасці — 16 гадоў. Найбольшы стаж — 29 гадоў, найменшы — 3 гады. У ліку фіналістаў — 4 настаўнікі-метадысты, 34 маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, астатнія маюць першую і адзін — другую кваліфікацыйную катэгорыю”, — расказала яна.

Сярэдні ўзрост удзельнікаў — 39 гадоў. Самаму маладому — 25 гадоў, самаму вопытнаму — 52 гады. Другі раз у конкурсе на рэспубліканскім узроўні ўдзельнічаюць 3 педагогі.

Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў “Настаўнік года Рэспублікі Беларусь” аб’яўляецца Міністэрствам адукацыі і праводзіцца адзін раз у тры гады. Асноўныя мэты — стварэнне ўмоў для распаўсюджвання эфектыўнага педагагічнага вопыту, выяўлення таленавітых, творчых педагагічных работнікаў, павышэння прэстыжу педагагічнай працы і прыцягнення ўвагі грамадскасці да тэндэнцый развіцця сістэмы адукацыі. Удзел у конкурсе могуць прымаць работнікі сферы адукацыі незалежна ад кваліфікацыйнай катэгорыі і стажу працы. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў праводзяцца напярэдадні прафесійнага свята — Дня настаўніка.

БЕЛТА